CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

**MOB 2020**

| WYPEŁNIA ZDAJĄCY | |
|---|---|
| KOD | PESEL |
| | |

*miejsce na naklejkę*

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM PODSTAWOWY

DATA: **21 maja 2020 r.**
GODZINA ROZPOCZĘCIA: **9:00**
CZAS PRACY: **170 minut**
LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

| WYPEŁNIA ZESPÓŁ NADZORUJĄCY |
|---|
| Uprawnienia ucznia do: |
| ☐ dostosowania kryteriów oceniania. |

NOWA FORMUŁA

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 12 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

MOB-P1_1P-202

Układ graficzny
© CKE 2015

**MOB 2020**

**Przeczytaj tekst i wykonaj zadania 1.–5.**

Сяргей Харэўскі
***Ідэйнасць, аўтэнтычнасць і даступнасць***

Сёння свет, поўны пярэчанняў паміж інфармацыйным багаццем і дэфіцытам ведаў, уяўляе сабой інфармацыйна-псіхалагічную пагрозу для назапашвання асабовых кампетэнцый. Музей […] быў і застаецца ўнікальным вынікам узаемадзеяння культуры і розуму чалавека. […] Сучасны музей – не толькі большае ці меншае сховішча артэфактаў[1], як антыкварная крама. Музей павінен узрушваць і змушаць да мыслення, як гэта, напрыклад, зроблена ў Музеі сучаснага мастацтва ў Стакгольме. Там наведвальнік не проста знаёміцца з імёнамі і творчасцю найбольш значных творцаў найноўшага часу, ад Пікаса і Маціса да Мандрыяна і Дзюшана, але – з тымі, хто мысліў катэгорыямі будучыні, сацыяльнага прагрэсу і гуманізму. […] Там няма афіцыёзнага акадэмізму ці камерцыйнай салоннасці.

Экспазіцыя ўкладзеная так, што ты міжволі кожны крок робіш толькі наперад, усведамляючы, якія выклікі свету непакоілі, трывожылі ці абуралі мастакоў. […]

Сучаснага наведвальніка музея можна назваць «новым культурным спажыўцом», арыентаваным не толькі на атрыманне канстатуючай дыдактычнай інфармацыі асветнага кшталту, але і на атрыманне задавальнення. Музей трансфармуецца, пераўтвараецца ў інстытут унутрыкультурнай рэфлексіі, пашыраючы жыццёвыя гарызонты наведвальніка. У гэтым сэнсе для мяне надзвычай важным быў досвед Туніса. У адрозненне ад многіх музеяў нашай часткі свету, там экспануецца толькі (!) аўтэнтыка. На Віле Себасцьяна ў Хамамэце, пабудаванай паводле праекту славутага амерыканскага архітэктара Ф. Л. Райта, дзе гасцявала французская, румынская і брытанская багема[2], можна ўбачыць сапраўдныя асабістыя рэчы […] нямецкага генерала Рамэля, Уінстана Чэрчыля, які пачаў тут пісаць свае мемуары, брытанскага караля Георга IV. Цяпер тут мастацкая галерэя, але засталіся паўсядзённыя пабытовыя рэчы колішніх гасцей, якія можна проста памацаць. […]

Гуманітарныя веды, нараджаючы вобраз, метафару, сімвал, робяць магчымым вычуць сэнсы, схаваныя часам ад рацыянальнага ўсведамлення. Вынікам становіцца якасная змена асобы: самаідэнтыфікацыя, здабыццё новага вопыту, зразуменне гісторыка-культурнай спадчыны як часткі свайго духоўнага жыцця. Але толькі пры ўмове несупыннага паўтору гэтага наратыву[3], беспасрэднага нашага ўдзелу ў музейных практыках. У гэтым сэнсе музеі нагадваюць храмы: калі ты туды не ходзіш рэгулярна, то тваё пачуццё буцвее[4] і гасне, жаданне вычуваць сэнсы слабее, а ўласна вычуванне сэнсаў глухне. Музеі і галерэі мусяць быць непарыўна прывязаныя да цэнтраў грамадскага жыцця. Яны павінны быць у крокавай даступнасці[5] ў самых цэнтрах гарадоў.

С. Харэўскі, *Ідэйнасць, аўтэнтычнасць і даступнасць,* www.partisanmag.by

---

[1] Артэфакт – любы штучна створаны чалавекам матэрыяльны прадмет, фізічны аб'ект (прылады працы, рэчы, адзенне і г.д.).
[2] Багема – асяроддзе творчай інтэлігенцыі (акцёры, музыканты, мастакі).
[3] Наратыў – гісторыя (аповед), гістарычна і культурна абгрунтаваная інтэрпрэтацыя некаторага аспекту свету з пазіцыі пэўнай асобы.
[4] Буцвець – трухлець, парахнець, гнісці, прэць.
[5] У крокавай даступнасці – вельмі блізка.

**Заданне 1. (0–1)**
**Ці на кожнае пытанне з табліцы можна знайсці адказ у першым абзацы тэксту? Падкрэслі ТАК, калі можна адшукаць адказ, альбо НЕ, калі нельга.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | У чым заключаецца падабенства музея і храма? | **ТАК** | **НЕ** |
| **2.** | Ці ёсць розніца паміж рэальным і віртуальным музеем? | **ТАК** | **НЕ** |
| **3.** | Якая роля і функцыі музея? | **ТАК** | **НЕ** |

**Заданне 2. (0–1)**
**Працытуй адзін сказ з трэцяга абзаца тэксту, у якім выражаецца меркаванне, і адзін сказ, у якім выражаецца факт.**

меркаванне

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

факт

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

**Заданне 3. (0–1)**
**Тлумачальны слоўнік беларускай мовы для слова *гарызонт* падае чатыры значэнні. З якім з іх суадносіцца гэтае слова ў трэцім абзацы? Выберы і пазнач правільны адказ.**

1. Лінія ўяўнага судакранання неба з зямной або воднай паверхняй. // Небасхіл.
2. толькі множны лік (гарызонты, -аў); пераноснае значэнне: Кола дзеянняў, магчымасцей.
3. Узровень вады ў рацэ ці вадаёме.
4. Пласт адкладанняў горных парод, які ўмоўна вылучаецца па якой-н. прымеце (колеру, складу, наяўнасці руд і інш.).

*Тлумачальны слоўнік беларускай мовы*, www.skarnik.by

**Заданне 4. (0–1)**
**Да кожнага з прыведзеных ніжэй слоў падбяры антонім.**

сучасны – .........................................................................................................................

прагрэс – ..........................................................................................................................

**Заданне 5. (0–2)**

**У якім стылі напісаны тэкст *Ідэйнасць, аўтэнтычнасць і даступнасць*? Падай адну характэрную асаблівасць гэтага стылю.**

стыль – ..................................................................................................................

асаблівасць – ..........................................................................................................

**Przeczytaj tekst i wykonaj zadania 6.–9.**

Міра Лукша

***„Белавежа" перад юбілеем***

Беларускаму літаратурнаму аб'яднанню „Белавежа" да юбілею 60-годдзя засталося паўгода. Заснавана яно было ў чэрвені 1958 года пры рэдакцыі штотыднёвіка беларусаў „Ніва", гуртуючы там аўтараў, якія пішуць па-беларуску ў Польшчы. […] Сярод пачынальнікаў беларускага літаратурнага руху ў Польшчы былі, між іншым, Георгій Валкавыцкі, Сакрат Яновіч, Уладзімір Гайдук, якія ўжо адышлі ў іншы свет. Ушаноўваем памяць памерлых „белавежцаў", у тым ліку і Яшы Бурша (Яна Анісэровіча [...]), Алены Анішэўскай, Міхася Шаховіча, Васіля Баршэўскага, Міколы Гайдука.

– На працягу ўсёй нашай гісторыі на творчым рахунку БЛА „Белавежа" назбіралася на сённяшні дзень агулам сотні кніжных публікацый, – адзначыў прафесар Ян Чыквін. – Пачатак дае „Рунь" у 1959 годзе, асобныя зборнікі паэтаў, кнігі ў серыі Бібліятэчкі „Белавежы", тамы „Тэрмапілаў" і штогоднікі „Году Беларускага". А колькасць паасобных твораў, апублікаваных усімі „белавежцамі" ў аўтарскіх кнігах, на літаратурных старонках, у календарах, альманахах, краёвых і замежных выданнях, а таксама ў перакладах застаецца, па сутнасці, ужо непалічальная.

Беларуская літаратура Польшчы – не выпадковая з'ява, а культурна-гістарычны вынік глыбокага нацыянальнага ўсведамлення сябе – беларусаў – беларусамі. Творчасць „белавежцаў" з'яўляецца выдатным прыгожым летапісам гэтай укаранёнай нацыянальнай свядомасці, якая безупынна аднаўляецца, безупынна асвяжаецца і з'яўляецца жывой. […] Многія творы „белавежцаў" трапілі ў школьныя праграмы. Творы „белавежцаў" вывучаюць на спецкурсах у беларускіх універсітэтах. Пісьменнікі „Белавежы" здаўна ўключаны ў агульнабеларускі літаратурны працэс і культурна-навуковы абмен каштоўнасцямі, і самі пісьменнікі, згуртаваныя ў „Белавежы", павінны мець свядомасць сваёй значнасці ў гэтых працэсах і несці асабістую адказнасць за падараваны ім найперш творчы талент...

Беларуская літаратура ў Польшчы мае свае рысы і адметнасці. Найперш яна характарызуецца тым, што не была саветызаваная, а мела і мае выразна выяўленую нацыянальную адметнасць, здаровы нацыянальны вектар. „Белавежцаў" у першую чаргу яднала і яднае не ідэйна-эстэтычная праграма, а шырока разуметыя нацыянальныя інтарэсы, нацыянальнае ахвярніцтва, абарона роднага. […]

Заснавальнікамі „Белавежы" было 18 чалавек, і сёння дзейсных „белавежцаў" прыблізна столькі ж. Як на пачатку, „Белавежа" спалучае ў сваіх шэрагах творцаў адразу трох-чатырох пакаленняў. Найстарэйшым сябрам нашай арганізацыі застаецца Антон Васілеўскі, а наймалодшая цяпер сяброўка літаб'яднання – Кацярына Сянкевіч – народжаная роўна сто гадоў пазней за яго – у 1991 годзе.

Паводле: „Ніва. Тыднёвік беларусаў у Польшчы", № 49 (3212) Год LXII, с.1.

**Заданне 6. (0–1)**

**Дапасуй па аднаму з прыведзеных пытанняў да канкрэтных абзацаў з тэксту, якія адказваюць на іх. Літарныя абазначэнні пытанняў упішы ў табліцу насупраць нумароў абзацаў.**

а) Якімі творчымі поспехамі могуць ганарыцца „белавежцы”?
б) Якія характэрныя рысы мае беларуская літаратура ў Польшчы?
в) Якую чытацкую аўдыторыю маюць беларускамоўныя аўтары ў Польшчы?
г) Калі і кім была заснаваная БЛА „Белавежа”?
д) Колькі пакаленняў творцаў аб’ядноўвае „Белавежа”?

| **Абзац** | **Пытанне** |
|---|---|
| 1. | |
| 3. | |
| 5. | |

**Заданне 7. (0–1)**

**Пазнач правільны адказ. Якім стылістычным сродкам з’яўляецца выдзеленае словазлучэнне ў наступным сказе?**

*На працягу ўсёй нашай гісторыі* ***на творчым рахунку*** *БЛА „Белавежа” назбіралася на сённяшні дзень агулам сотні кніжных публікацый.*

**А**. Гіпербала.
**Б.** Метанімія.
**В.** Параўнанне.
**Г.** Метафара.

**Заданне 8. (0–2)**

**Акрэслі стаўленне аўтара да БЛА „Белавежа”. Для абгрунтавання свайго адказу прывядзі цытату з тэксту.**

.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................

**Заданне 9. (0–3)**
**Напішы рэзюмэ да тэксту аб’ёмам 40–60 слоў.**

...........................................................................................................................................

...........................................................................................................................................

...........................................................................................................................................

...........................................................................................................................................

...........................................................................................................................................

...........................................................................................................................................

...........................................................................................................................................

...........................................................................................................................................

**Заданне 10. (0–37)**
**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie**

**Тэма 1. Ці варта змагацца за сваё каханне? Паразважай над пытаннем на падставе ўрыўка п’есы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча *Пінская шляхта*, цэлага твора і выбранага тэксту культуры. Твая праца павінна налічваць не менш за 250 слоў.**

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч
***Пінская шляхта***

З’ява I
*Марыся.* Ой, так! Няхай ганіць бацька, няхай лае маці, а я люблю Грышку і любіць яго век буду. Ой, бедныя ж нашы галованькі!.. Што гэта за дур напаў на бацькоў? П’яныя завяліся ды пабіліся з сабою за шляхецтва, а мы з Грышкам праз тое гаруем і ныем. Яго бацька падаў на майго ў суд скаргу, і сягоння прыедзе ў ваколіцу найяснейшая карона на прасоку[6]. У ім цэлае наша спасенне. Як прыедзе, дык мы з Грышкам паклонімся яму ў пояс ды будзем прасіць ды маліць, каб ён пагодзіў нашых бацькоў ды каб яны дазволілі нам пажаніцца. А ён такі сярдзіты, не дапускай ты госпад! Як наставіць адзін вус угору, а другі ўніз ды крыкне: па найяснейшаму ўказу! − то бацькі спалохаюцца ды зладзяць нам вяселле... Ды што гэта зрабілася Грышку? *(Грышка паціху паказваецца з-за дзерава, крадучыся да Марысі).* Баюся, каб не паўставалі бацькі, − нельга было б пабачыцца з ім. *(Устаўшы, пахаджваючы па сцэне, гаворыць.)* Ой, Грышка, Грышка! Ты штось цяпер зрабіўся вельмі лянівы. Табе, пэўна, сэрца цяпер так ужо не ные па мне... Як прыйдзе, дык пакажуся перад ім сярдзітаю і хоць будзе прасіць і маліць, каб пацалавала, дык не пацалую. Дальбог, што не пацалую!

З’ява II
*Грышка.* Дык я ж і прасіць не буду, сам цябе пацалую. *(Цалуе яе.)*
*Марыся.* Ах, Грышка, нядобры! Як ты спалохаў мяне, гневаюся не жартам!..
*Грышка.* Гневаешся? Няпраўда! А чаму ж ты на мяне так міленька пазіраеш?
*Марыся.* Так, са злосці!.. Нягодны, дзе ты забаўляўся? Гэта ж зараз прыйдуць бацькі, а мы так многа маем з табою перагаварыць.

[6] Прасока – расследаванне справы.

*Грышка.* Выбачай, мілая Марыся, − чуць золак, я з’ездзіў ужо да места, кінуўся ў ногі асэсару[7] і прасіў, каб ён узяў нас пад сваю апеку.
*Марыся.* Трэба было завезці які гасцінчык.
*Грышка.* Дык я ж завёз яму двух зайцоў, тры пары цецерукоў ды кадобчык мёду. Ён усе прыняў ласкава і сказаў, што сёння ж прыедзе на разборку справы майго бацькі з тваім. Ой, наварылі бацькі сабе кашы, будзе што есці! Ён вельмі сярдзіты, − бо адзін вус калом угору стаў. Будзе вазня!
*Марыся.* Дай Бог, каб гэта каша нам зубоў не папрышчыла!
*Грышка.* Ён дакляраваў зрабіць нам вяселле. На Богу ды на ім − уся наша надзея.

1866 год

В. Дунін-Марцінкевіч, *Пінская шляхта*, http://knihi.com

**Тэма 2. Зрабі аналіз верша. Пастаў інтэрпрэтацыйны тэзіс і абгрунтуй яго. Твая праца павінна налічваць не менш за 250 слоў.**

Наталля Арсеннева
***Сягоння***

Мне кажуць, што пісаць заўсёды, усюды можна.
Папера, алавік[8], натхненне... верш гатоў.
Паэт, абы прысеў, а верш змайструе, зложыць
з радкоў, як з сена, умірг[9] патрапіць скідаць стог.
Але пра што пісаць?
                                        Прарокам быць на часе,
нізаць каралі рос, вянок асенні віць?
Пажарышчаў дзікіх мой верш і так не згасіць,
не змые з душ людскіх пурпуравай крыві.
Дапраўды, што пісаць і заўтра,
                                                    і сягоння?
Трупоў не ўваскрасіш санетам аб вясне.
Сягоння
            кожны верш хаўтурным[10] звонам звоніць,
найлепшай рыфмай рот галодны не заткнеш...
Пісаць аб салаўёх, аб снежнай белі вішняў?
Замоўклі салаўі пад медны рык гармат,
а белы вішняў снег таксама смешна лішні, −
аб іншым гойстры[11] штых нам піша аж зашмат.
Няхай жа свет гарыць, хай плавіцца ў горне
грымотных новых дзён, куецца, як нарог.
Нарэшце мо й паэт харэі, ямбы згорне
і зноў пачне пісаць, гуслярыць...
                                                    Даў бы Бог!

Н. Арсеннева, *Сягоння*, [у:] В. Сянкевіч, Я. Грыгарук, *Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ,* Warszawa 2001, с. 199–200.

---

[7] Асэсар – засядацель суда.
[8] Алавік – аловак.
[9] Умірг – вельмі хутка.
[10] Хаўтурны – сумны, тужлівы (у пераносным значэнні).
[11] Гойстры – тое ж, што і востры.

## WYPRACOWANIE

**na temat nr....................**

**Tabelę wypełnia egzaminator!**

| | | Liczba punktów | Suma | Uzasadnienie przyznania 0 punktów |
|---|---|---|---|---|
| rozprawka | A. | 0 – 3 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 6 – 9 – 12 | | |
| interpretacja | A. | 0 – 2 – 4 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 8 – 12 | | |
| | C. | 0 – 1 – 2 | | |
| | D. | 0 – 2 – 4 | | |
| | E. | 0 – 1 – 2 | | |
| | F. | 0 – 1 – 3 | | |
| | G. | 0 – 2 – 4 | | |
| | H. | 0 – 2 – 4 | | |

## BRUDNOPIS *(nie podlega ocenie)*